Паважаная Марыя Якаўлеўна!

Дасылаю абяцанае пра нашу Дусю.

Прабачай, што не перадрукаваў. Я сам не умею, хадзіў да сваёй машыністкі — занятая.

Матэрыял, здаецца, патрэбны, праўдзівы. Вы ж, відаць, знаеце, што яе той сёй і не далюбліваў. Відаць, ад зайздрасці, але большасць пісьменнікаў яе ~~новы~~ паважалі.

Гэта была сапраўдная паэтэса.

З павагай Ваш М. Скрыпка

М. Скрыпка

Міхась Скрыпка 20

21

# Наша Дуся.

Перад тым, як напісаць гэтыя ўспаміны пра Еўдакію Якаўлеўну, я падумаў: а сапраўды, калі я з ёй першы раз сустрэўся? І ніяк не мог прыпомніць. Няма́ла ёсць такіх людзей, з якімі, здаецца, ты ўсё жыццё знаёмы.

Яна была добрым, простым чалавекам і таленавітай паэтэсай. У яе было цяжкае дзяцінства, апаленае вайной, пакутамі блакіроўкі. Пасля вайны вучоба — педтэхнікум, педінстытут, Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. У яе была прагная натура да ўсяго добрага. Не гледзячы на цяжкія гады юнацтва, творы яе прасякнуты добрым настроем, радасцю жыцця. Ды і самі назвы паэтычных зборнікаў — сведкі гэтаму: „Людзі добрыя", „Хараство", „Яснавокія мальвы" і другія. І зборнікі для дзяцей з падобнымі светлымі назвамі.

„Мне і ў смутку любы долы нашы родныя,
Мне сіроцтва не глушыла жаўрукоў...
А чаму растуць з бацькамі — ды нягодныя,
А чаму не цэняць любасцю бацькоў"

Так пісала яна ў зборніку „Яснавокія мальвы".

Еўдакія Якаўлеўна вельмі любіла дзяцей. Калі яе запрашалі настаўнікі ў школу для сустрэч са школьнікамі, яна ніколі не адказвалася. І калі даводзілася быць на сустрэчах дзе на яе радзіме — Віцебшчыне ці на Брэстчыне, заўсёды любіла пагаварыць з малечай да выступлення ці пасля.

Неяк раз я пажартаваў, што яна закахана ў маіх хлапцоў.

— Калі ж яны дужа падобны на майго Дзіму. Ой, як жа ён там дома, ці накормлен парой, ці дагледжан.

А вечарам званок з гасцініцы, як даросламу:

— Як там без мяне жывецца? Не сумуеш? Трымайся! Хутка буду дома, убачымся. Я нешта́чка табе прывязу. Глядзі — не падвядзі!

„Сынок мой, хлапчук дапытлівы,
Прыйшоў з дзіцячага сада
І кажа: „Мама, Амерыка —
Гэта што бомбы кідае?"
„Кідае, сынок, — адказваю,
І робіцца мне маркотна:
Вось як яно пачынаецца,
Яго адкрыццё Амерыкі!"
Як ты сабе паганіш, Амерыка!

А якія ў яе пранікнёныя вершы пра дзяўчат „у шынялях да пят" якія несуць усе пакуты вайны разам з салдатамі. І як ім „хацелася жыць і прыгожымі быць", і як яны любаваліся ў люстэрках балотнай вады. Але ў цяжкім баю гераічна паміралі разам з мужчынамі, абараняючы родную зямлю.

Паэтэсе гэтых вобразаў не трэба было прыдумляць. Усё гэта было у яе на вачах у тыя цяжкія часы.

Еўдакія Лкаўлена была прыгожай, прывабнай жанчынай. Неяк раз у Саюзе пісьменнікаў выступаў маршал Савецкага Саюза Чуйкоў. Еўдакія Лкаўлена ўручыла яму, праслаўленаму герою, букет кветак. Ён пацiснуў ёй руку і з усмешкай сказаў таварышу, што быў побач:

— Ну, праўду я табе казаў, што у Беларусі вельмі прыгожыя жанчы. І вельмі ж яны добрыя і гераічныя. Многа іх было ў час вайны у нас і разведчыц, і снайпераў, і ўрачоў.

Чалавек, як вядома, добра пазнаецца на сумеснай рабоце, у паездках. Неяк раз запрасілі групу пісьменнікаў на Віцебшчыну. У складзе групы былі — Еўдакія Лкаўлена Лось і яе зямляк, празаік Алесь Шашкоў, Янка Скрыган, Пятро Прыходзька, Павел Ткачоў і Георгі Шыловіч.

Кнігагандаль выдзеліў нам дзве машыны — адну для пісьменнікаў а другую для нашых кніг і для ўсіх дзяўчат-прадаўшчыц.

За дзень мы аб'ездзілі некалькі раёнаў вобласці. Дзяўчаткі прадалі добрую тысячу нашых кніг. Мне даводзілася часцей за ўсё выступаць разам з Еўдакіяй Якаўлеўнай. Я звярнуў увагу на яе сур'ёзныя адносіны да выступленняў. У рэдкіх выпадках яна чытала па кнізе (звычайна новыя вершы). А то ўсё напамяць. І ўражанне было такое, што яна гэта проста расказвае пра сябе, пра віцебскіх партызан, пра тое, што яна перажыла дзяўчынкай у блакадзе.

А як ганарылася яна героямі віцеблян, сваімі знакамітымі паэтамі, празаікамі — Пятрусём Броўкам, Рыгорам Барадуліным, Васілём Быкавым, Міхасём Лыньковым.

На выступленні ў адным вучылішчы, дзе аўдыторыя была выключна дзявочая, паэтэсе задалі пытанне „пра цяперашняе і ранейшае каханне". Еўдакія Якаўлеўна адказала урыўкам з свайго верша „Пра каханне"

Я гатова многае прыняць —
Новы твіст і валасы-салому,
Пра каханне ж хочацца сказаць:
„Дзеванькі, кахайце па-старому!"

Еўдакія Лось належыць да тых майстроў слова, якія заўсёды адклікаюцца на ўсе падзеі нашага жыцця. Прычым вершы яе вызначаюцца сваёй шчырасцю, яснасцю і завостранасцю думкі.

Неяк раз пасля выступлення Еўдакія Якаўлеўна пажалілася мне, што ноч не магла заснуць: вечарам сустрэла маладую жанчыну-зямлячку з Ушацкага раёна, з якой была ў блакадзе. Яе цяпер пакрыўдзілі за нейкую там недарэчнасць. — Вось закончым свае сустрэчы, паеду ў райком. Трэба заступіцца за такую жанчыну, тым больш, што яна, на маю думку, не вінавата. А ёй я маю права верыць.

Прайшло ўжо колькі год, як няма між нас нашай Дусі. Але ўсё ж яна жыве між людзей сваімі творамі і добрымі ўспамінамі пісьменнікаў і ўсіх тых, з кім яна дружыла ці проста — была знаёма.

Міхась Скрыпка [1970-я гг]

Арыгіналы знаходзяцца ва ўстанове
«Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва»